УДК 81.23

# СЕМАНТЫЧНАЯ КЛАСІФІКАЦЫЯ ЛЕКСІКІ НАРКАСПАЖЫЎЦОЎ У МАЛАДЗЁЖНЫМ СЛЭНГУ

***Д. В. Якаўчык*** (Магілёўскі інстытут МУС)
Навук. кір. ***С. В. Венідзіктаў***,
канд. філал. навук, дацэнт

Маладзёжны слэнг – від моўнага субстандарту, сацыялекту, які ўзнік з супрацьпастаўлення моладзі старэйшаму пакаленню і афіцыйнай сістэме [2]. Адной з найбольш дынамічных яго груп з’яўляецца лексіка наркаспажыўцоў, якая ўяўляе сабой дэвіянтна маркіраваны лексічны пласт [1]. Намі было праведзена даследаванне па пошуку і сістэматызацыі слоў, якія адносяцца да наркаслэнгу. Асновай для пошуку сталі інтэрнэт-слоўнікі slovonovo.ru, teenslang.su, друкаваныя выданні слоўнікаў слэнгу, інтэрнэт-блогі і форумы.

Па семантыцы сярод лексікі наркаспажыўцоў, што стала часткай маладзёжнага слэнгу, можна вылучыць канструкцыі, якія абазначаюць: (а) наркатычныя рэчывы: *батва* (канаплі), *белы* (эфедрын, какаін), *баўтанка* (эфедрон); (б) прылады для спажывання наркатычных сродкаў: *алберка, агрэгат, гепатыт, заноза* (шпрыц), *бульбулятар, вапарайзер* (кальян або аналагічная прылада); (в) фізічныя і псіхічныя станы: *атама* (стан санлівасці пасля ўжывання наркотыкаў), *аўт* (стан страты сувязі з навакольным светам), *ацыдоз, блюмстрэм, валакуша* (агульны стан наркатычнага ап’янення), *гліпцень* (зменены стан свядомасці з жаданнем весці філасофскія гутаркі); (г) месца ўжывання наркотыкаў: *віла, лежбішча, кайф-базар* (прытон наркаманаў); (д) спосаб спажывання наркотыкаў: *абшабашыцца* (выпаліць), *бахацца, даўбіцца* (спажываць наркотык праз вену), *глыткаёшыць* (ужыць у выглядзе таблетак).

Вынікі даследавання могуць быць выкарыстаны ў падрыхтоўцы навукова-метадычнага забеспячэння дысцыплін «Асновы прафайлінгу», «Псіхалогія дэвіянтных паводзін», «Аператыўна-вышуковая дзейнасць» і іншых, а таксама ў службе супрацоўнікаў міліцыі.

**Літаратура**

1. **Венидиктов, С. В.** Речевой субстандарт и психолингвистическая диагностика: к проблеме лексикографического описания / С. В. Венидиктов, Е. Е. Иванов // Ученые записки Казанского юрид. ин-та МВД России. – 2021. – Т. 6. – № 2 (12). – С. 314–318.

2. **Яковчик, Д. В.** Криминальный пласт речевого субстандарта / Д. В. Яковчик // Научный поиск курсантов: сб. материалов Междунар. науч. конфер., Могилев, 16 февр. 2022 г. / Могилев. ин-т МВД ; редкол.: В. В. Борисенко (отв. ред.) [и др.]. – Могилев, 2022. – 1 эл. опт. диск.



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова